# ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ «СЦЯЖЫНКАМІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ: ШЧЫТКАВІЦКАЯ ПРОШЧА»

***Аўтары:*** *творчая група навучэнцаў аб’яднання па інтарэсах “Знаўцы роднага краю” дзяржаўнай установы адукацыі “Вучэбна-педагагічны комплекс Шчыткавіцкі дзіцячы сад – сярэдняя школа”.*

***Кіраўнікі:*** *Качан Таццяна Іванаўна, настаўнік рускай мовы і літаратуры, Лялькіна Аляксандра Валянцінаўна, настаўнік інфарматыкі.*

**Мэта экскурсіі:** выхаванне ў навучэнцаў маральных якасцей грамадзяніна і патрыёта праз вывучэнне гістарычных помнікаў малой радзімы.

**Задачы:**

зацікавіць навучэнцаў гісторыяй сваёй малой Радзімы;

далучыць навучэнцаў да эстэтычных і культурных асаблівасцей экскурсійнай дзейнасці;

арганізаваць вольны час навучэнцаў.

**Тып экскурсіі:** аглядна-тэматычная.

**Від экскурсіі:** пешаходная.

Працягласць экскурсіі: 3 гадзіны (1 гадзіна на дарогу).

Адлегласць: 4км 900 м.

**Катэгорыя экскурсантаў:** масавая (дарослыя, навучэнцы).

**Маршрут экскурсіі:** месцам сустрэчы з групай экскурсантаў з’яўляецца школа ў аг.Шчыткавічы, потым па вуліцы Леніна (2 км) выходзім на трасу Асіповічы-Бабоўня (1 км), зварочваем улева на лясную дарогу да вайсковай часці (1 км), не даходзячы да часці, зварочваем улева на вузкакалейку ў лес (900 м).

**Змест экскурсіі:** падчас экскурсіі удзельнікі азнаёмяцца з гісторыяй узнікнення, паводле ўяўленняў мясцовых вернікаў, святога месца, аднаго з “цудаў” Старадарожчыны – Шчыткавіцкай Прошчай; даведаюцца аб незвычайных уласцівасцях Прошчы – знакамітым спосабе “лячэння” ад розных хвароб.

**Агульныя арганізацыйныя і метадычныя ўказанні:**

экскурсавод павінен мець пэўны запас ведаў па гісторыі Беларусі старажытнага перыяду, у тым ліку па гісторыі роднага краю;

экскурсаводу мэтазгодна пры сабе мець даведнік з патрэбнай інфармацыяй; папярэдзіць удзельнікаў аб правілах бяспечных паводзін падчас правядзення экскурсіі (падчас пераходу ад аб’екта да аб’екта, на дарозе, у Прошчы).

# ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ “СЦЯЖЫНКАМІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ: ШЧЫТКАВІЦКАЯ ПРОШЧА”

| Маршрут экскурсіі | Аб’екты паказу | Час | Асноўныя пытанні | Арганізацыйныя і метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|
| Пачатак экскурсіі | Месца збору групы – ДУА “ВПК Шчыткавіцкі дзіцячы сад – сярэдняя школа” | 20хвілін | Даць агульныя звесткі аб мэце і задачах экскурсіі.<br>Адзначыць: на паўднёвым усходзе Мінскай вобласці на мяжы з Магілёўскай размясціўся Старадарожскі раён, у паўночна-заходняй частцы якога знаходзіцца наша малая Радзіма – ваколіцы Шчыткавіцкага сельсавета.<br>Пазнаёміць удзельнікаў экскурсіі з укладам жыцця беларусаў-сакуноў (традыцыямі, звычкамі, вераваннямі і інш.). Паведаміць аб вучоным-этнографе І.Сербаве і яго кнізе “Беларусы-сакуны”. Паводле яе, жыхары нашай мясцовасці (Шчыткавіч, Церабут, Ляўкоў, Застарычча і інш. вёсак) належаць да сакуноў.<br>Сакуны – частка самага большага беларускага племені дрыгавічоў, якія насяляюць верхнюю плынь ракі Пціч і яе прытоку Арэсы. Сакунамі завёмся таму, што ўсе дзеясловы на *“ся”* ў нас вымаўляюцца на цвёрдае *“са”*. У нас кажуць: *наеўса, выспаўса.* Праўда, цяпер так гавораць толькі старажылы.<br>Вёскі нашай ваколіцы размешчаны на невялікіх нізінных астраўках сярод непраходных багнаў і балотаў верхняга Палесся Мінскай вобласці.<br>Цікавымі па паходжанні з’яўляюцца назвы вёсак нашых ваколіц. | Усталяваць эмацыянальна-псіхалагічны кантакт з групай.<br>Яркім уступным словам дапамагчы настроіцца на экскурсію.<br>Паведаміць тэму экскурсіі, яе маршрут і працягласць, месца і час заканчэння экскурсіі. |
| Перакры- | Гарыстыя | 20хвілін | Паведаміць экскурсантам, што праз Ляўкі, | Група стаіць збоку дарогі |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| жаванне дарогі з аг.Шчыт-кавічы з трасай Асіповічы – Бабоўня | ўчасткі дарогі, прыродныя асаблівасці мясцовасці | | Шчыткавічы і Церабуты цягнецца суцэльнай паласой пясчаная ўзгорыстая града, якая месцамі паднімаецца вышэй за 100 метраў над узроўнем мора і густа засеяна валунамі *(паводле І.Сербава)*.<br>Адны ўзгоркі пакрыты сасновым борам, а другія ўжо распаханы пад палі. Па нізінах месцамі расце елка, асіна, вольха, іва, бяроза, а на раўніне – дуб, граб, клён, ліпа. На балоце месцамі сустракаюцца нізкарослыя бярозкі і сосны. Раней, яшчэ да асушэння балот, дрыгва была густа пакрыта асакой, чаротам, яварам.<br>На імшаных балотах і ў зарасніках па купінках сярод багульніку растуць ягаднікі: журавіны, брусніцы, буякі. | для лепшага агляду.<br>Пры дапамозе прыёму лакалізацыі экскурсавод ўсталёўвае сувязь дадзенага месца з падзеямі, тым самым прыкоўваючы погляды экскурсантаў да асаблівасцей мясцовых краявідаў. |
| “Цуда” Старада-рожчыны – Шчыткавіцкая Прошча | Шчыткавіцкая Прошча: “крыжыкі”, каплічка | 1 гадзіна | Расказаць экскурсантам аб тым, што ў мінулыя часы ў Беларусі прошчай называлі святыя крыніцы, калодзежы, асобныя дрэвы, камяні, тоўстыя пні спіленых дрэў. Слова “прошча” значыць “просьба, прашэнне”. Лічылася, што тут, у прошчы, духі вады, дрэў або камянёў могуць адгукнуцца на ўпрошванне. У надзеі на прыхільнасць у ваду кідалі манеты, на галінах дрэў развешвалі ручнікі, клалі манеты ў выемкі камянёў. Дзяўчаты на выданні навязвалі featured рознакаляровыя стужкі і прасілі добрага, працавітага жаніха, які не п’е.<br>Цікава адзначыць, што святароў царквы не вельмі бянтэжыла язычніцкае паходжанне абраду. Яны самі імкнуліся выкарыстаць гэта: ставілі на гэтых месцах праваслаўныя крыжы, іншы раз і невялічкую каплічку, служылі літургіі, на святы ішлі туды з хрэсным ходам.<br>Гісторыя Шчыткавіцкай Прошчы вельмі цікавая. У 1908 годзе мясцовыя жыхары адкрылі для | Група стаіць на лясной дарозе, узбоч “крыжыкаў”, для лепшага агляду.<br>Пры дапамозе прыёму лакалізацыі экскурсавод ўсталёўвае сувязь дадзенага месца са старадаўнімі падзеямі, тым самым прыкоўваючы погляды экскурсантаў да асаблівасцей Прошчы.<br>Уступным словам экскурсавод арыентуе групу на тое, што можна ўбачыць падчас агляду. Затым ідзе самастойнае азнаямленне з месцам.<br>Жадаючыя выконваюць абрады навязвання стужак |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | сябе ў лесе Прошчу. Здарылася гэта так: у дзень праводнай нядзелькі (першая нядзеля пасля Вялікадня) бабе Алене, калі яна збірала грыбы-вяселікі (вясновыя грыбы), у лесе з'явілася Маці Божая з Дзіцем на руках. Алена аслепла. Праз нядзелю яна занесла на гэтае месца каравай хлеба і адразу стала відушчай. На другі год па ўказанні Святога Алена паставіла на месцы з'яўлення Божай Маці крыж і назвала само месца Прошчай.<br>Потым некаторыя старыя людзі з ваколіц Шчыткавіч пад уздзеяннем відзенняў ставілі на Прошчы капліцы, крыжы. Пазней у кожную маладзіковую нядзелю да прошчы на паклон сыходзіліся тысячы багамольцаў з усёй акругі. Святар, закончыўшы абедню ў царкве, з крыжовым ходам ішоў да Прошчы і служыў там малебен. Багамольцы, зняможаныя рознымі хваробамі, на каленях поўзалі вакол капліц, бралі жмені зямлі з таго месца, дзе, паводле паданняў, ляжала пад невялікім дрэвам Дзіця. Тады ж была пабудавана драўляная царква. Малебны у Прошчы праводзяцца і зараз па вялікіх святах.<br>У 30-ыя гады XX стагоддзя ішла барацьба з рэлігіяй, святыя месцы знішчаліся. Прошча каля Шчыткавіч была знішчана таксама. І толькі ў апошнія дзесяцігоддзі месца зноў набывае свой гістарычны святы змест.<br>Ходзяць чуткі, што Прошча вылечвала паралітыкаў, кульгавых, глухіх, бяздзетных жанчын не толькі з мясцовых ваколіц, але нават з Расіі, Літвы. Сёння гэта месца зноў стала набываць былую "папулярнасць", у першую чаргу, дзякуючы намаганням настаяцеляў царквы Святых | на крыжык (на добрага мужа), бяруць жменьку зямлі са "святога" месца (на здароўе, асабліва жаночае). Таксама ахвяруюць грошы. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | бяссрэбранікаў Касмы і Даміяна ў Шчыткавічах, мясцовага насельніцтва. | |
| Заканчэнне экскурсіі | Месца збору групы – ДУА “ВПК Шчыткавіцкі дзіцячы сад – сярэдняя школа” | 20хвілін | Падвядзенне вынікаў экскурсіі.<br>Экскурсавод адказвае на ўзнікшыя пытанні, дзякуе за ўвагу. | Заключнае слова павінна быць кароткім, яркім і змястоўным.<br>Пажадана раздаць удзельнікам буклеты, даведнік “Сцяжынкамі малой радзімы”. |





Фота 1. Выгляд Прошчы напрыканцы 90-х гадоў 20 стагоддзя

Фота 2. Навучэнцы школы падчас экскурсіі на Прошчу з настаўнікам Галенсонам Б.І.





Фота 3. Выгляд Шчыткавіцкай Прошчы летам 2018 года.На месцы былой каплічкі пабудавана новая

Фота 4. Выгляд Шчыткавіцкай Прошчы ў кнізе вучонага-этнографа І.Сербава “Беларусы-сакуны”



Фота 4. 2 верасня 2018 года, асвячэння капліцы ў гонар Іверскай іконы Божай Маці